Ганна ЗАПАРТЫКА

# З ГІСТОРЫІ ПЕРШЫХ ТВОРЧЫХ ЮБІЛЕЯЎ ЯНКІ КУПАЛЫ

*Да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі КУПАЛЫ*

1920-я гады ў жыцці Янкі Купалы былі вельмі плённымі і па-грамадзянску актыўнымі. У гэты перыяд Пясняр друкуе агромністую колькасць вершаў, выходзяць першыя зборы яго твораў, кнігі «Спадчына» і «Безназоўнае», газеты змяшчаюць палымяную публіцыстыку, у тэатрах ставяцца спектаклі па яго п'есах. Нягледзячы на такую напружаную творчую працу, Я. Купала ў гэтыя гады мае пасаду загадчыка бібліятэкі пры Беларускай хатцы, рэдагуе часопісы «Рунь» і «Вольны сцяг», а з 1921 г. працуе намеснікам загадчыка літаратурна-выдавецкага аддзела Наркамасветы БССР. У тую ўздымную эпоху Янка Купала быў сярод ініцыятараў стварэння Беларускага драматычнага тэатра (1920), Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921), Інстытута беларускай культуры (1922), літаратурнага аб'яднання «Полымя» (1927).

Менавіта ў 1920-я гады паэт узышоў на вяршыню народнага прызнання і творчай славы. Пра гэта гавораць і дзве выдатныя падзеі, што адбыліся ў жыцці Янкі Купалы і ў гісторыі культуры Беларусі ў 1920 і 1925 гг. Гаворка пойдзе пра дзве юбілейныя даты: 15 і 20 творчых гадоў Песняра.

15-гадовы юбілей творчай працы Янкі Купалы адзначаўся даволі сціпла. Час быў такі, час не спрыяў творчаму рушанню, як не спрыяў і творцам. Ішла вайна. Але ўсё ж паплечнікі і сябры паэта 24 чэрвеня 1920 г. сабраліся ў Мінску ў былым Юбілейным доме (цяпер Дом мастацтва) на ўрачысты сход. Па некаторых звестках прысутнічала каля ста чалавек: пісьменнікі, палітычныя і грамадскія дзеячы. З таго юбілею захаваўся унікальны дакумент — здымак удзельнікаў, зроблены, магчыма, ля таго самага Юбілейнага дома. На здымку побач з паэтам і яго жонкай Уладзіславай Францаўнай Язэп Лёсік, крайні злева ў чацвёртым радзе Алесь Гарун, чацвёрты ад яго Аляксандр Уласаў, у перадапошнім — Змітрок Бядуля і Браніслаў Тарашкевіч і многія іншыя асобы, вядомыя і невядомыя. У большасці — гэта даўнія знаёмыя паэта і добрыя сябры па працы ў Вільні і Мінску. Многа моладзі. На сходзе з хвалюючым словам выступіў юбіляр: «Дарагія Грамадзянкі і Грамадзяне зямлі Беларускай! Вітаю Вас і дзякую Вам ад усяго сэрца за тую памяць, якую Вы захацелі аказаць у сягонняшні дзень мне і маёй пятнаццацігадовай працы на ніве беларускай! Але толькі павінен я тут адзначыць, што гэта пятнаццацігадовая гадаўшчына не да мяне аднаго адносіцца, яна адносіцца да шмат каго з прысутных тут, адносіцца да ўсяго апошніх часаў руху ў беларускім адраджэнні»[1]. У хуткім часе сустрэчы з многімі сябрамі са здымка стануць немагчымымі. Праз месяц адыдзе ў вечнасць Алесь Гарун, Аляксандр Уласаў і Браніслаў Тарашкевіч апынуцца ў Польшчы. Былое пабрацімства будзе жыць толькі ў памяці.

Зусім у іншых варунках святкаваўся наступны юбілей. У прысвячэнні з нагоды 20-гадовага юбілею творчай дзейнасці Янкі Купалы ў траўні 1925 года паэт-маладняковец Уладзімір Дубоўка прамовіў:

> «Не пісаў юбілейных я вершаў
> Аніразу яшчэ дагэтуль.
> Юбілей, як сягоння — першы!
> Дык вітанне паэта паэту».[2]

---

[1] Янка Купала. Поўны збор твораў. Т. 8. Мн., 2002. С. 92.

[2] Маладняк Янку Купалу. Менск, 1925. С. 59.

Гэта і праўда быў першы юбілей у літаратурнай гісторыі Беларусі, які па-сапраўднаму стаўся ўсенародным, які адзначаўся ў навуковых і культурных установах, школах і клубах, з нагоды якога былі напісаны артыкулы і вершы, у тэатрах ставіліся п'есы, а пошта прызнанага паэта была перапоўнена прысвячэннямі і вітаннямі. Дастаткова зазірнуць у кнігу «Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы», каб упэўніцца ў гэтым. Сёння, напярэдадні 125-гадовага юбілею вялікага Купалы, той юбілей у яго творчай біяграфіі ў многім падаецца сімвалічным і прадвызначальным. У згаданай ужо кнізе, укладзенай нястомным Генадзем Васільевічам Кісялёвым, апублікавана 32 дакументы, якія адлюстроўваюць нязмушаны ўздым вакол імя Янкі Купалы. Калі дакладна выбудаваць хроніку падзей — атрымліваецца, што першымі віталі Я. Купалу рэдакцыі часопісаў «Асвета» і «Беларускі піянер», бо ўжо 19 траўня «Савецкая Беларусь» апублікавала тэкст гэтага прывітання: «20 гадоў таму назад ты, наш дарагі юбіляр, узяў на сябе вялікую і слаўную ролю пісьменніка тады загнанага беларускага народа.

Твой гучны кліч да змагання «за праўду, за шчасце, за лепшую долю» не зарос палыном; дзесяцітысячная армія культурна-асветных працаўнікоў поўнаю жменяю чэрпае залатыя зярняты з багацця твaёй творчасці…»[1]. На наступны дзень Я. Купалу віталі ўжо Таварыства па навуковым вывучэнні Беларусі пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце і Беларускі дзяржаўны музычны тэхнікум. Да канца траўня «Савецкая Беларусь» надрукавала віншаванні ад Старшыні ЦВК БССР і СССР А. Чарвякова, калектыву Мінскай балотнай доследнай станцыі, супрацоўнікаў Бабруйскага акруговага аддзела народнай асветы, Б. І. Эпімах-Шыпілы і С. Некрашэвіча (Ленінград), рэдакцыі часопіса рагачоўскага педтэхнікума, настаўнікаў і вучняў смілавіцкіх сямігодак, 19-й беларускай сямігадовай школы г. Мінска, калектыву доследнай школы пры БДУ; рэдакцый



*Янка Купала сярод маладнякоўцаў. 1925 г.*

[1] Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы. Укл. Г. В. Кісялёў. Мн., 1981. С. 154.






*15-гадовы юбілей творчасці Янкі Купалы.*
*На фрагменце — жонка паэта Уладзіслава Францаўна. 1920 г.*

часопісаў «Нова книга», «Червоний шлях», рэдакцыі часопіса «Селянськїй будинок» (Украіна), калектываў Барысаўскага белпедтэхнікума і Варонецкага сельскагаспадарчага тэхнікума і інш.

Вельмі ўрачыста і па-акадэмічнаму грунтоўна адсвяткаваў гэтую дату Інбелкульт, арганізаваўшы 28 траўня спецыяльнае пасяджэнне, прысвечанае 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы, на якім з дакладамі выступілі М. Гарэцкі, М. Піятуховіч, Маркаў. Якуб Колас прачытаў сваю алегарычную навелу «Ноч, калі папараць цвіце», а юбіляр — верш «Шляхам гадоў».

Але, як выявілася, гэта быў толькі пачатак юбілейных мерапрыемстваў у Беларусі і нават за яе межамі. 29 траўня Народны камісарыят асветы БССР разаслаў усім сваім падначаленым установам «абежнік», дзе было сказана: «28 мая бягучага года мінула дваццаць год, як Янка Купала распачаў сваю літаратурную дзейнасць, змясціўшы ў мінскай расейскай газеце за 15 мая (па старому стылю) 1905 г. свой верш «Мужык».

За гэтыя дваццаць год Купала развінуўся ў выдатнага нацыянальнага паэта, волата беларускага прыгожага пісьменства, які праз увесь час сваёй літаратурнай працы будзіў сялянскія гушчы ад цяжкага сну прымусу і заклікаў да сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

НКАБ уважае за патрэбнае адзначыць памянёную юбілейную дату ў кожнай культурна-асветнай установе, каб як мага шырэй азнаёміць моладзь і працоўныя гушчы з вялікім беларускім песняром і яго творчасцю.

Маючы на ўвазе вышэйнапісанае, НКАБ прапануе наладзіць у школьных і навучальных установах вечарыны, прысвечаныя творчасці Купалы, па такой прыблізна схеме: даклад аб жыцці і творчасці паэта, чытанне яго твораў, канцэртны аддзел.

Адначасна НКАБ робіць захады аб надрукаванні партрэтаў Янкі Купалы, якія будуць разасланы на гэтых днях.

Аб адбыўшыхся ўрачыстасцях з прычыны юбілею маеце дакладна паведаміць НКАБ.

Дзень святкавання абіраюць самі культурна-асветныя ўстановы паміж 1 і 15 чэрвеня г. г.

***Нам. Наркамасветы Баліцкі***
***Кіраўнік спраў Красінскі»[1].***

Мяркуючы па Летапісе жыцця і творчасці Янкі Купалы, змешчаным у дзевятым томе Поўнага збору твораў чэрвень 1925 года ў жыцці паэта быў вельмі насычаны падзеямі і шматлікімі паездкамі па Беларусі. І яшчэ агромністай колькасцю юбілейных вітанняў. 4 чэрвеня Пясняр прысутнічае на вечарыне і чытае свае вершы ў Доме Рабасветы ў Віцебску, 6 — 7 чэрвеня — у Горы-Горках, далей Орша, 11 чэрвеня — зноў Віцебск. Па Беларусі пракацілася цэлая хваля юбілейных вечарын і сустрэч: у Бабруйску, дзе быў пастаўлены 1-шы акт «Тутэйшых», у горацкіх школах, Гомельскім педтэхнікуме, у Клімавічах і інш.

10 чэрвеня 1925 г. СНК БССР прыняў пастанову аб тым што «Савет Народных камісараў уважае за патрэбнае адзначыць гэты юбілей [і] пастанаўляе:

1. Надаць Яну Дамінікаву Луцэвічу (Янку Купалу) імя Беларускага народнага паэта.

2. Прызначыць яму на ўсё жыццё персанальную пенсію ў 150 руб. на месяц»[2].

25 чэрвеня газета «Савецкая Беларусь» апублікавала падпісанае двума днямі раней прывітанне ЦВК БССР і СНК БССР «Беларускаму народнаму паэту Яну Дамінікавічу Луцэвічу (Янку Купалу)».

У гэтым нечуваным шматгалоссі пастаноў і калектыўных прывітанняў, у народным уздыме асобную ролю адыгрывала літаратурнае згуртаванне «Маладняк». Многія ініцыятывы і шчырыя парыванні як мага актыўней адзначыць гэты юбілей належаць менавіта гэтай маладзёжнай літаратурнай суполцы.

Стаўленне маладнякоўцаў да Янкі Купалы было асаблівым. Ён меў сярод моладзі бясспрэчны аўтарытэт і карыстаўся агромністай павагай. Юбілей 20-годдзя творчай дзейнасці Я. Купалы маладнякоўцы рыхтавалі аднымі з першых. Самае грунтоўнае, што запланаваў «Маладняк», было выданне зборніка. Зборнік пад назвай «Маладняк Янку Купалу» выйшаў акурат да юбілею. Эпіграфам да зборніка былі ўзяты радкі з верша Я. Купалы «Арлянятам»: «Для вякоў дыхтуйце новых / Нечувалыя ясноты». Рэдакцыйная камісія ва ўступным слове выбачалася: «Брак сродкаў не дазваляе нам адзначыць юбілей вялікага паэта — сьвята культуры рабоча-сялянскай Беларусі — выданьнем зборніку ў запраектаваным разьмеры.

Абмежаваныя гэтым, робім тое, што ў нашых маладнякоўскіх магчымасьцях, спадзеючыся, што Інстытут Беларускае Культуры да 25-гадовага юбілею паправіць гэту хібу.

Зразумела, што ў невялічкім зборнічку мы не маглі даць артыкулаў па разгляду творчасьці юбіляра, а абмежаваліся невялічкім уступным, які характарызуе адносіны Янкі Купалы да Маладняка і наадварот.

Выбраныя вершы згрупаваны не па цыклях. Можна сказаць, што, нават, не ад усіх цыкляў узяты па аднаму вершу.

Усё-ж мы лічым, што гэты, хоць і невялічкі зборнік, але разгорне перад рабоча-сялянскім чытачом — асабліва перад моладзьдзю адну з лепшых старонак у поэзіі **вялікага песьняра Беларусі Янкі Купалы**».[3]

У зборніку было змешчана прывітанне «Усебеларускага Аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў Маладняк», уступнае слова Ул. Дубоўкі «Да 20-гадовага юбілею Янкі Купалы» (15.V.1905—15.V.1925), артыкул А. Бабарэкі «З жыцьцёпісу Янкі Купалы». Ул. Дубоўка, аналізуючы творчасць Песняра, не абышоў, зразумела, і яго першы надрукаваны верш — нагоду юбілейнай даты. «У часе найвялікшага заняпаду Беларусі ва ўсіх адносінах, у часе незвычайнага ўціску Беларусі з боку царызму, Янка Купала пачаў складаць свае першыя песьні. Не рабская прыбітасць, не пакутныя стогны і енкі, якімі поўнілася паэзія таго часу, а бунтарская працоўна-сялянская воля чулася ў іх.

«І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык,
Што хоць мной кожны пагарджае,
Я буду жыць! — бо я мужык».[4]

[1] Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы. С. 146.
[2] Там сама. С. 147—148.
[3] Маладняк Янку Купалу. Менск. 1925. С. 7.
[4] Маладняк Янку Купалу. Менск. 1925. С. 10.



*Янка Купала, Цішка Гартны, Андрэй Александровіч, Міхась Зарэцкі і інш. 1925 ці 1926 гг.*

Адам Бабарэка, разглядаючы жыццёвы і творчы шлях Купалы, вызначыў агульную скіраванасць яго светапогляду, «які характарызуецца імкнёнасцю —

З цэлым народам гутарку весці
Сэрца мільёнаў падслухаць біцця…»[1]

Зразумела, што асноўную частку зборніка, склалі выбраныя вершы Янкі Купалы — усяго трынаццаць, якія завяршаюцца вершам «Шляхам гадоў» з прызнаннем «Ад шчырага сэрца пасьвячаю ўсім, хто добрым словам успомніў мяне ў дзень юбілею». Асобны раздзел складаюць «Пасьвячэнні». Маленькі зборнічак стаў вялікім і дарагім падарункам песняру.

27 траўня ў клубе «Чырвоны прафінтэрн» на пляцы Волі ў Мінску адбыўся арганізаваны маладнякоўцамі вечар, прысвечаны Я. Купалу (заўважым, што на дзень раней Інбелкультаўскага акадэмічнага пасяджэння). Былі запрошаны прадстаўнікі многіх арганізацый і ўстаноў г. Мінска. З грунтоўным дакладам аб жыцці і творчасці песняра выступіў Ул. Дубоўка. Многія паэты-маладнякоўцы напісалі да гэтага дня вершы ў гонар Я. Купалы, якія ўпершыню прагучалі са сцэны клуба. Чытаў свае творы і ўсхваляваны юбіляр. Вядучыя святочнага мерапрыемства і прадстаўнікі ўстаноў Мінска зачыталі тэлеграмы і прывітанні.

Праявілі актыўнасць і філіі «Маладняка» ў розных гарадах Беларусі. Яшчэ 14 траўня Магілёўская філія, трымаючыся Статута арганізацыі, але з таварыскай патрабальнасцю даслала ў Цэнтральнае бюро ліст:

«Дарагія таварышы!

Сёньні споўнілася 20 год літ[аратурнай] працы Я. Купалы.

Некалькі ўстаноў афіцыйна зьвярнуліся ў Маладнякоўскую філію, каб мы правялі, наладзілі юбілей Я. К[упалы].

Ня маючы ніякіх вестак, ніякіх дырэктываў нельга было адважыцца што-небудзь пачаць без належных мерапрыемстваў у цэнтру, устрымоўваемся што-небудзь ладзіць, ня будучы ў курсе тэй палітыкі, якая маецца ў адносінах да юбіляра. Прашу як найхутчэй, — тэлеграмай калі можна (нават абавязкова тэлеграмай!), паведаміць што рабіць!

У такіх выпадках пажадана, каб ЦБ паведамляла за тыдзень раней…

14 V-25 г.»

Магчыма, што менавіта гэты ліст даў штуршок да выпрацоўкі ў ЦБ «Маладняка» звароту «Да ўсіх філій»:

«Таварышы!

Споўніўся 20-гадовы юбілей аднаго з старэйшых і разам з тым самага выдатнага песьняра Беларусі Я. Купалы.

Вельмі пажадана, каб кожная філія чарговы свой сход прысвяціла нашаму дарагому юбіляру.

ЦБ з свайго боку вызначае такую павестку:

1) Невялікі даклад аб творчасьці Я. Купалы.

2) Дэклямацыя характэрных для юбіляра вершаў.

3) Калі ёсць хор — дык выкананне вершаў Я. Купалы, паложаных на музыку.

4) Чытка маладнякоўскіх вершаў прысьвечаных юбіляру.

[1] Тамсама. С. 24.

Добра было-б, каб вечар быў шырока грамадзянскі».[1]

Вечарыны, літаратурныя чытанні і сустрэчы, зладжаныя маладнякоўцамі, прайшлі ў Бабруйску, Оршы, Горках, Віцебску, Магілёве і многіх іншых гарадах.



*Янка Купала, Ян Райніс з узвышанцамі. 1926 г.*

«Не голасам у пустэчы, а зернем, паўшым на добрую глебу, былі Вашы песьні.

Багаты плён далі яны, узрасціўшы новыя творчыя сілы — «Маладняк».

І бацьку свайму — Купалу — бабруйская філія «Маладняк» шле гарачае прывітанне і шчырае пажаданне далейшай творчай працы».[2] Такімі словамі, ці вельмі блізкімі да іх, віталі Я. Купалу на многіх маладнякоўскіх мерапрыемствах.

«Ты адзін, ад усіх найвялікшы,
маладых гадаваў сваёй песьняй.
Я стаю, галаву схіліўшы,
з абяцаннем твой заклік здзейсніць», —

дэкламаваў Ул. Дубоўка.

Усе гэтыя ўхвалы і прызнанні моладзі былі для Янкі Купалы бясконца дарагімі. Янка Купала і маладое пакаленне літаратараў 1920-х гадоў выяўлялі поўнае ўзаемаразуменне і ўзаемапавагу. Як сказаў Алег Лойка ў сваім рамане-эсэ «Як агонь як вада…»: «Чалавек, які любіў зару, у ранкавыя 20-я гады Купала быў у іх стыхіі як рыба ў вадзе. Дух яго маладзіўся: дзе было беларускае слова, там быў Купала, дзе была моладзь, там быў Купала».

У ліпені 1925 г. загадам Наркамасветы Беларусі Янка Купала пакінуў працу ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Як народнаму паэту яму была прызначана пенсія і мажлівасць вольнай творчай працы.

[1] БДАМЛМ. Ф. 225. Воп. 1. Адз.зах. 9. С. 105.
[2] Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы. С. 156.